# ЭТНАДЫЗАЙН ЯК СРОДАК ЗАХАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ СПАДЧЫНЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ КЕРАМІЧНАГА ПОСУДУ БЕЛАРУСІ XIV-XVIII СТАГОДДЗЯЎ)

# ETHNODESIGN AS A MEANS OF PRESERVING TRADITIONAL HERITAGE (ON THE MATERIAL OF BELARUSIAN CERAMIC DISHES OF THE 14th-18th CENTURIES)

Н. І. Здановіч, В. А. Вараб'ёва
N. Zdanovich, O. Varabyova

Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт
Мінск, Рэспубліка Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт
Мінск, Рэспубліка Беларусь
Belarusian State Technological University
Minsk, Republic of Belarus
Belarusian State University
Minsk, Republic of Belarus
*e-mail: Ninazdan@tut.by; VorobOA@bsu.by*

---

У артыкуле паказана роля этнадызайну як сродка захавання традыцыйнай культурнай спадчыны; разглядаюцца шляхі ўзнікнення форм керамічнага посуду ў XIV–XVIII стст.: мадыфікацыі гаршка як базавай формы ў асартыменце керамікі, арыентацыя на сінтэз мясцовых і запазычаных форм, запазычванне праз перайманне, паўтарэнне форм імпартнага посуду з захаваннем ці зменай функцыяналнага прызначэння; з'яўленне новых форм як адказ на функцыянальныя патрэбы тагачаснага грамадства.

Ключавыя словы: керамічны посуд; асартымент; гаршчок; мадыфікацыі; запазычанні; сінтэз; імітацыя, этнадызайн.

The article shows the role of ethnodesign as a means of preserving traditional cultural heritage; ways of emergence of forms of ceramic dishes in the XIV-XVIII centuries are considered.: modifications of the pot as a basic form in the assortment of ceramics, focus on the synthesis of local and borrowed forms, borrowing through imitation, repetition of forms of imported dishes with preservation or change of functional purpose; the emergence of new forms as a response to the functional needs of the contemporary society.

Keywords: ceramic dishes; assortment; a pot; modifications; loans; synthesis; imitation, ethnic design.

Ва ўмовах глабалізацыі сучаснай культуры важнай застаецца праблема захавання традыцыйнай народнай спадчыны, актуалізацыя яе зместу і формы і ўкаранення ў сучасны сацыякультурны кантэкст. Этнадызайн як адна з форм адаптацыі народнай культуры прадугледжвае мадэрнізацыю традыцыйных сэнсаў з улікам каштоўнасных арыентацый, актуальных для кожнага з этапаў сацыякультурнага развіцця, што садзейнічае стварэнню прывабнага і ўнікальнага вобраза традыцыйнай культуры і фарміраванню нацыянальнай ідэнтычнасці.

Мэта работы – раскрыць генезіс керамічнага посуду на тэрыторыі Беларусі XIV-XVIII стст., паказаць шляхі стварэння традыцыйных форм на аснове іх мадыфікацыі, сінтэзу, імітацыі, з улікам функцыянальных патрэб грамадства на кожным гістарычным этапе, раскрыць значэнне традыцыйных форм для захавання і актуалізацыі культурнай спадчыны і магчымасці іх выкарыстання ў этнадызайне.

Аналіз археалагічнага посуду XIV-XVIII стст. з раскопак гарадоў і замкаў Беларусі праводзіўся па двух кірунках: вывучэнне асартыменту і эвалюцыя выяўленых форм у часе.

У асартыменце посуду базавай формай ва ўсе часы быў *гаршчок*. Ён быў універсальнай формай, на якой адпрацоўваліся ўсе тэхналагічныя прыёмы і прыёмы формаўтварэння. Ён меў універсальную функцыю: у ім гатавалі (варылі, тушылі), з яго елі. Гэта значыць гаршчок быў і кухонным, і сталовым посудам да XVI ст., пакуль не страціў апошнюю функцыю. Уласна асартымент посуду тады азначаў выраб розных па аб’ёму гаршкоў. Гэта выяўляецца ў статыстыцы керамічных калекцый з любога населенага пункту (горада, замка, мястэчка). Пацверджаннем гэтай універсальнасці з’яўляецца арнаментацыя, упрыгожванне гаршкоў. Да канца XV ст. гэта быў арнамент, які наносіўся ў тэхніцы рыфлення. На непаліваных гаршках XVI–XVII сттс. арнамент – даволі рэдкая з’ява. І наносіўся ён не па сырым вырабе (непасрэдна на крузе падчас фармоўкі), а па падсушаным вырабе, пра што сведчыць ледзь заўважная яго рэльефнасць.

Мадыфікацыі гаршка – першы шлях з’яўлення новых керамічных форм: і посуду для прыгатавання страў, і сталовага посуду. Простай абрэзкай яго ніжэй найбольшага дыяметра тулава ствараецца *міска.* Абрэзка на ўзроўні экватара ці крыху вышэй стала асновай формы *ла-*

*так* – начынняў для пражання страваў. Асаблівасць апошняй формы – у прапорцыях (вышыню начыння вызначае дыяметр донца, а памер венца звычайна ў два разы большы). У афармленні края венца латкі прасочваецца аналогія з першакрыніцай – *гаршком*. У Панямонні ў XIV-XV стст. распаўсюджваюцца плыткія (глыбінёй 4–5 см) *патэльні-латкі*, якія нагадваюць ніжнюю частку таго ж абрэзанага *гаршка*, толькі з вялікім дыяметрам донца.

У сваю чаргу *міска* цыліндрычнай, усечанаканічнай ці піялападобнай формы, толькі большых памераў (вышыней да 15–20 см і блізкім да яго дыяметрам тулава), стала асновай *макотраў* – начынняў для расцірання маку, размешвання цеста і г. д. Новыя формы з цягам часу ўдасканальваюцца пад уздеяннем практычных функцыянальных патрэб. Глыбокія латкі на зломе набываюць рэльефны арнамент (часцей пальцавыя зашчыпы), каб бяспечна даставаць гарачае начынне са стравою з печы. Плыткія *патэльні-рынкі* для такой жа мэты набываюць цыліндрычную полую ручку з дыяметрам да 4 см і даўжыней у шырыню далоні.

Другі шлях развіцця асартыменту – праз сінтэз мясцовага і запазычанага. Класічны прыклад – *талеркі*, якія з’яўляюцца ў нас не раней за XVI ст. Але ад класічнай італьянскай «дошкі для разразання мяса» застаецца толькі прынцып: піялападобная ніжняя частка і шырокі (да 5 см) борцік, адагнуты амаль гарызантальна. Аднак гэтае запазычанне не было простым перайманнем формы. Талеркі былі сталовым начыннем, прызначаным для сервіроўкі стала. У нас жа функцыя іх пашырылася: у XVI–XVII стст. *талеркі* выкарыстоўваліся ў якасці посуду як для індывідуальнага карыстання, так і для агульнага: у іх накладаліся стравы падчас застолляў, і яны расстаўляліся на сталах. Таму на аснове еўрапейскіх талерак у нас сфармаваўся від посуду, што ў пісьмовых крыніцах XVII ст. называўся *паўмісак* [1, с. 137]. У ім злучылася глыбіня *міскі* і шырыня борціка ад класічнай *талеркі*. Толькі борцік адхіляўся пад вуглом прыкладна 45° [2, мал. 187, 197].

У эпоху Адраджэння мела месца таксама запазычанне новых форм. Класічным прыкладам можа быць *рынка* – патэльня на трох ножках з цыліндрычнай ручкаю для смажання страваў [3, с. 113]. Аднак сведчаннем творчай перапрацоўкі формы можа быць разнастайнасць афармлення края яе венца ў розных рэгіёнах Беларусі, а таксама з’яўленне глыбокай *рынкі*. Гэта была *макотра* на трох высокіх ножках з дзвюма петлепадобнымі сіметрычнымі ручкамі. Абодва віды начын-

ня былі прыкладам сінтэзу мясцовай формы посуду і запазычанняў. Аднак новыя формы сталі дапаўненнем да функцыянальна блізкіх пасудзін для смажання і пражання страваў – плыткіх і глыбокіх *латак*. І апошнія аказаліся больш жывучымі: калі ў XVIII ст. змянілася канструкцыя печаў з'яўляюцца печы з фаеркамі замест суцэльнай ліставой рабочай паверхні), рынкі паступова знікаюць, а *латкі* паспяхова працягваюць выконваць сваю функцыю.

Трэці шлях развіцця асартыменту посуду – запазычанне праз імітацыю, паўтарэнне форм прывазнога посуду. Прыкладам могуць быць *куфлі* – цыліндрычныя ці блізкія да цыліндра начынні для пітва з адной-дзвюма ручкамі. Аднак у архітэктоніцы і асабліва ў аздобе прасочваецца імітацыя тэхналогіі драўлянай разьбы (у форме і «фармаванні» ручак).

Імітацыя як паўтарэнне формы мясцовага посуду ў іншым матэрыяле фіксуецца ў асартыменце начынняў для пітва: напрыклад, *шкляніцы* усечан-канічнай формы паўтараюцца ў дымленых бакалах з Мсціслава [4, с. 195–201].

Чацвёрты шлях узнікнення форм – адказ на функцыянальныя патрэбы з улікам тыпалагічнага мыслення. Верагодна, так з'явіліся базавыя формы тарнай керамікі: *збаны*, *гладышы*, *глякі* і *біклагі*. Тут архітэктоніка падпарадкоўваецца функцыянальнай патрэбе. У *збаноў* унутраны дыяметр горла не павінен быць менш 12 см (каб пралезла рука). Гэта – гігіенічная патрэба, бо ў збаны налівалася і малако.

Для *гладышоў* жа, наадварот, быў важны памер знешняга дыяметра горла, каб можна было яго абхапіць рукою. І ў адсутнасці ручкі абавязковай была наяўнасць валікападобнага завяршэння венца, каб не саслізнула рука. Па той жа прычыне гладышы, у адрозненне ад збаноў, не пакрываліся палівай звонку.

*Глякі* – гэта начынні, прызначаныя не толькі для захоўвання, але і для пераноскі вадкасцяў, таму мелі вузенькае горла. Яны павінны быць устойлівымі і заўсёды мелі значна шырэйшае, чым у збаноў, донца.

Для *біклагі* былі важныя памеры аб'ему (звычайна не больш за 1 л), таму што прызначаліся для ручной пераноскі.

Два апошнія віды начынняў былі вузкаспецыялізаванымі: прызначаліся для вадкасці аднаго віду ці вадкасці, якая лёгка выпаласквалася з ёмістасці. Прыкладам, у пісьмовых крыніцах узгадваюцца глякі «на алей».

Такім чынам, працэс развіцця асартыменту керамічных форм на працягу XIV–XVIII стст. ішоў рознымі шляхамі. Ён адлюстроўваў працэс індывідуалізацыі спажывання, а таксама развіцця тэхналогіі прыгатавання ежы. Новыя формы, адаптаваныя да мясцовых традыцый, дапаўнялі асартымент керамічнага посуду. Мела месца і імітацыя форм шклянога посуду ў кераміцы. У сваю чаргу, тэхналагічныя сляды на асобных відах посуду сведчаць пра магчымы ўплыў тэхналогіі дрэваапрацоўкі на іх фінальную апрацоўку. Кожная з форм пры захаванні сваёй функцыі можа стаць паказчыкам самабытнасці і ўнікальнасці нацыянальнай культурнай спадчыны народа, што дае падставу для іх актыўнага выкарыстання ў этнадызайне.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Приходно-расходная книга города Могилева за 1688 г. // Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской (ИЮМ). Витебск, 1874.
2. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т.4. Помнікі XIV–XVIII стст.; пад аг. рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. Мінск : Беларуская навука, 2001.
3. *Здановіч Н. І., Трусаў А. А.* Беларуская паліваная кераміка XI–XVIII ст. Мінск : Навука і тэхніка, 1993.
4. *Здановіч Н. І., Трусаў А. А.* Мсціслаўскі посуд XV–XIX стст. // Помнікі культуры : Новыя адкрыцці. Мінск, 1985.